http://edoc.bseu.by

определение исторического места и роли экономической социологии в структуре социально-гуманитарного знания;

раскрытие социальной природы экономического поведения, влияния на него экономического сознания и экономической культуры;

увязка особенностей социальной структуры общества, процессов социальной стратификации и мобильности с функционированием экономики на различных уровнях;

актуализация проблем и поиска адекватных путей институционализации рыночной экономики в белорусском обществе;

ознакомление с особенностями использования трудового потенциала в современной экономике, социальными факторами развития трудовых ресурсов;

формирование социально-гуманитарных мировоззренческих взглядов на роль и место экономики в социальном прогрессе;

обучение навыкам социологического анализа экономических процессов, социального развития трудовых коллективов в сфере экономики, социальных резервов производства, предпринимательской деятельности и др.

***Г.П. Бушчык,*** *БДЭУ (Мінск)*

## РОЛЯ КУРСАВЫХ І НАВУКОВЫХ СТУДЭНЦКІХ РАБОТ ПА ЭКАНАМІЧНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ ВА ЎДАСКАНАЛЕННІ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ПА МІЖНАРОДНЫХ ЭКАНАМІЧНЫХ АДНОСІНАХ

З ростам значэння самастойнай працы ў падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі мэнавіта напісанне курсавых работ стварае ўмовы для знаёмства студэнтаў не толькі з вучэбнай, але і навуковай літаратурай, для творчага самастойнага асэнсавання мінулага вопыту эканамічнага развіцця, нацэльвае на вырашэнне сучасных праблем з улікам гэтага вопыту, іх глыбіннага асэнсавання. Падрыхтоўка курсавой работы з'яўляецца больш высокім узроўнем у вывучэнні прадмета, чым простае запамінанне вучэбнага матэрыялу. Праца над такой работай дазваляе асвоіць навыкі пастаноўкі задачы, пошуку сродкаў у дасягненні вучэбнай мэты, фармулявання асноўных задач даследавання, яго вынікаў. Такім чынам, фарміруюцца і актывізуюцца творчыя магчымасці

будучых спецыялістаў, яны вучацца самастойна здабываць веды, а часам і ствараць новы інтэлектуальны прадукт.

Здольныя да навуковай працы студэнты выяўляюць свае магчымасці менавіта пры напісанні курсавых работ. На факультэце МЭА з самага пачатку першага семестра студэнтам, жадаючым у далейшым рыхтаваць свае работы да конкурсаў і канферэнцый, прапануюцца тэмы курсавых работ з большым даследчыцкім патэнцыялам, арыентацыяй на будучую спецыяльнасць, магчымым працягам у якасці курсавой работы па спецыяльнасці, альбо яе часткі, а таксама дыпломнай работы і нават будучай дысертацыі. Такі падыход дазваляе фарміраваць спецыялістаў з шырокім кругаглядам, грунтоўным разуменнем каранёў тых ці іншых працэсаў у сучасным эканамічным жыцці. Студэнты факультэта МЭА пры напісанні курсавых і навуковых работ актыўна даследуюць развіццё *эканамічных сувязяў Беларусі з рознымі краінамі і рэгіёнамі* ў розныя гістарычныя перыяды, найперш у 90-я гг. XX ст.

*Праца са статыстычнымі даведнікамі, дакументамі, матэрыяламі міністэрстваў Рэспублікі Беларусь і пасольстваў замежных* краін, архіўнымі справамі і экспанатамі музеяў — усё гэта дазваляе дасягнуць даволі высокага навуковага патэнцыялу пры напісанні работ і дабіцца поспехаў на універсітэцкіх і рэспубліканскіх канферэнцыях, друкаваць тэзісы выступленняў ужо на першым курсе. Так, сярод удзельнікаў студэнцкай канферэнцыі БДЭУ ў красавіку 2002 г. па дзвюх падсекцыях кафедры эканамічнай гісторыі студэнты курса ФМЭА складалі 1/3 частку, сярод васьмі пераможцаў па гэтых падсекцыях пяць — гэта студэнты факультэта МЭА. Тэзісы іх выступленняў былі надрукаваны ў зборніку па выніках канферэнцыі і чацвёра з іх паслалі работы на рэспубліканскую канферэнцыю. Па выніках канферэнцыі толькі студэнты-бюджэтнікі атрымалі прэмію дэканата (другое з пяці), што несправядліва, таму прапануецца пераможцаў і прызёраў студэнцкіх канферэнцый па секцыях узнагароджваць прэміямі дэканата незалежна ад формы навучання і выдзяляць грашовыя рэзервы на гэта цэнтралізавана.

Абарона курсавых работ і выступленні з навуковымі дакладамі — вельмі важны аспект у агульным працэсе працы над гэтымі работамі. На жаль, даволі распаўсюджана практыка індывідуальнага прыёму абароны, калі выкладчык адзін на адзін высвятляе веданне студэнтам зместу работы. Такім чынам губляецца вялікі патэнцыял вучэбнай і выхавaўчай працы, які можа даць публічная

абарона работы перад студэнцкай групай. Выкарыстанне выступленняў з дакладамі па курсавых альбо навуковых работах на семінарах з'яўляецца выкарыстаннем такой творчай формы семінара як навуковая канферэнцыя. Выступленне з вучэбным даследаваннем дазваляе не толькі скарыстаць больш высокі ўзровень такога выступлення, чым звычайны адказ на семінары, але і зацікавіць студэнтаў нетрывіяльнай інфармацыяй, творчай дыскусіяй па абмяркоўваемай праблеме.

Курсавыя работы па эканамічнай гісторыі з'яўляюцца першымі ў шэрагу курсавых работ, якія выконваюць на працягу вучобы студэнты ФМЭА. Гэта накладвае адказнасць на выкладчыка за навучанне студэнтаў правілам збору інфармацыі, яе абагульнення, вызначэння плана работы, аналіза дадзеных, афармлення тэкста, атрымання высноў. Такая карпатлівая і працаемкая справа патрабуе шмат часу, пастаянных кантактаў са студэнтамі, кансультацый, дапрацовак папярэдніх варыянтаў, і для якой абсалютна недастаткова дзвух гадзін, выдзеленых выкладчыку эканамічнай гісторыі на кіраўніцтва курсавымі работамі. Да таго ж на курсавыя работы па іншых эканамічных дысцыплінах выдзяляецца 3 гадзіны, хаця студэнты ўжо валодаюць навыкамі напісання такіх работ, і гэта некалькі спрашчае працу наступным кіраўнікам курсавых праектаў. Прапаную з улікам вышэйадзначанага, на кіраўніцтва напісаннем курсавой работы па эканамічнай гісторыі выдзеліць такую ж колькасць гадзін, як і на напісанне іншых курсавых работ.

Такім чынам, напісанне курсавых работ па эканамічнай гісторыі, далейшае развіццё гэтай працы ў рэчышчы навуковых даследаванняў студэнтаў з'яўляецца важным накірункам у павышэнні якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў эканамічнага профілю і патрабуе ўдасканалення стымулявання гэтай працы.

***В.Г. Саморядов,*** *БГЭУ (Минск)*

## КУРС «ЭТИКА» В СИСТЕМЕ СОЦИАЛЬНО-ГУМАНИТАРНОЙ ПОДГОТОВКИ

В соответствии с образовательными стандартами в цикле социально-гуманитарных дисциплин предусматривается изучение курса «Этика», объем которого для студентов экономического уни-